Гісторыя дзяржавы і права

УДК 348:342:271.2-7«17/19»

А.П. Грахоцкі

АДМІНІСТРАЦЫЙНАЯ СТРУКТУРА РУСКАЙ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ Ў СІНАДАЛЬНЫ ПЕРЫЯД: КАЛІЗІІ КАНАНІЧНАГА І СВЕЦКАГА ПРАВА

У артыкуле разглядаецца працэс трансфармацыі адміністрацыйнай структуры Рускай праваслаўнай царквы пад уздзеяннем расійскай «канфесійнай дзяржавы». Распачатая ў пятроўскую эпоху рэгламентацыя прававога статуса Рускай праваслаўнай царквы была заклікана падначаліць канфесію дзяржаўнай уладзе і інкарпараваць яе адміністрацыйны апарат у бюракратычную структуру імперыі. «Адзяржаўленне» Царквы суправаджалася кардынальнай ломкай яе кананічнага ўладкавання: Руская праваслаўная царква пазбавілася свайго вышэйшага кананічнага органа – Памеснага Сабора – і патрыяршага праўлення; кіраўніком Царквы ў расійскім заканадаўстве абвяшчаўся імператар; секулярнымі прававымі нормамі быў зменены кананічны парадак абрання епіскапату; функцыі агентаў сацыяльнага дысцыплінавання насельніцтва былі даручаны прыходскаму кліру; шэраг секулярных функцый, звязаных з дысцыплінаваннем кліру і наглядам за выкананнем прыходскім духавенствам дзяржаўных абавязкаў, ускладаўся на благачынных. Такім чынам, Руская праваслаўная царква пазбавілася статуса аўтаномнага грамадскага інстытута, ператварыўшыся ў «Ведомство православного исповедания». Дзяржаўнае заканадаўства, якое рэгламентавала адміністрацыйную структуру Царквы ў сінадальны перыяд, супярэчыла нормам кананічнага права. Артыкул разлічаны на спецыялістаў і шырокае кола чытачоў.

Уводзіны. Даследаванні прававой рэгламентацыі ўзаемаадносін дзяржавы і рэлігійных аб'яднанняў, прававога статусу канфесій з'яўляюцца неад'емнай часткай навуковай праблематыкі «заходняй» юрыспрудэнцыі [1]. Адыход ад дыскрымінацыйных прынцыпаў савецкай канфесійнай палітыкі актуалізаваў гэтую праблематыку і на постсавецкай прасторы. Ва ўмовах пабудовы грамадзянскіх супольнасцяў у былых савецкіх рэспубліках вывучэнне гістарычнага вопыту прававой рэгламентацыі царкоўна-дзяржаўных дачыненняў садзейнічае фарміраванню партнёрскіх узаемаадносін паміж дзяржавай і рэлігійнымі аб'яднаннямі, забеспячэнню міжканфесійнай згоды і ўдасканальванню заканадаўства аб свабодзе сумлення.

Мэтай нашага даследавання з'яўляецца асвятленне працэсу трансфармацыі адміністрацыйнай структуры Рускай праваслаўнай царквы (далей – РПЦ) пад уздзеяннем расійскай «рэгулярнай» дзяржавы. Перад намі не стаяла задача даць вычарпальную характарыстыку прававога статусу кожнага са звёнаў гэтай структуры. У рабоце засяроджваецца ўвага на вызначэнні ступені адпаведнасці/неадпаведнасці царкоўнай адміністрацыйнай вертыкалі патрабаванням кананічнага права і адлюстраванні механізмаў яе інкарпарацыі ў бюракратычны апарат «канфесійнай» дзяржавы.

У праваслаўным дыскурсе дамінуе пункт гледжання аб тоеснасці паняццяў «кананічнае» і «царкоўнае права» [2, с. 13–14]. У нашым жа даследаванні мы будзем раздзяляць гэтыя паняцці. Пад кананічным правам мы разумеем сістэму прававых норм, якія санкцыянаваны непасрэдна Царквой у эпоху Сусветных Сабораў (каноны Старажытнай Царквы) і рэгулююць царкоўныя, а таксама свецкія праваадносіны, што на той час належалі да юрысдыкцыі Царквы. Царкоўнае права – гэта сістэма прававых норм, якія рэгулююць унутрыцаркоўныя праваадносіны і ўзаемадачыненні паміж Царквой і дзяржавай, прынятыя дзяржаўнымі ці царкоўнымі органамі [3, с. 6].

Храналагічныя рамкі даследаваня ахопліваюць перыяд ад пачатку сінадальнай эпохі (1721 г. – ліквідацыя патрыяршаства і стварэнне Сінода) па 1905 г., калі шырокія дзяржаўныя

Грахоцкі Аляксандр Паўлавіч, аспірант каф. тэорыі і гісторыі дзяржавы і права УА «ГДУ імя Ф. Скарыны» (Гомель); навук. кір. – В.А. Кадаўбовіч, канд. юрыд. навук., дац., загадчык каф. дзяржаўна-прававых дысцыплін Інстытута кіравання і прадпрымальніцтва (Мінск).

Адрас для карэспандэнцыі: вул. Савецкая, 104, 246000, г. Гомель, Беларусь; e-mail: grahocki@mail.ru

і грамадскія пераўтварэнні, выкліканыя Маніфестам ад 17 кастрычніка, істотна паўплывалі і на характар царкоўна-дзяржаўных узаемаадносін.

Пытанні прававога становішча РПЦ у Расійскай імперыі, Савецкім Саюзе і сучаснай Расіі звяртаюць на сябе ўвагу расійскіх правазнаўцаў. Па дадзенай праблематыцы абаронены дысертацыі М.Г. Дробінай, А.А. Дорскай, А.М. Гудзяніцы, А.Г. Залужнага, Я.Л. Шапашнікава [4–8]. На момант падрыхтоўкі гэтага артыкула ў Маскоўскай дзяржаўнай юрыдычнай акадэміі імя А.Е. Кутафіна рыхтуецца да абароны доктарская дысертацыя А.М. Пецюковай [9].

Пяру расійскіх гісторыкаў належыць шэраг навейшых манаграфій, прысвечаных гісторыі царкоўна-дзяржаўных узаемаадносін і асобным царкоўным інстытуцыям у імперскі перыяд [10–14]. Прававыя аспекты «веравызнаўчай» палітыкі і асаблівасці прававога становішча РПЦ у Расійскай імперыі разглядаюцца ў артыкулах беларускага даследчыка А.Ю. Бендзіна і расійскага гісторыка А.Ю. Міхайлава [15–18]. Праблемы імперскай канфесійнай палітыкі і яе спецыфікі на «ўскраінах» імперыі адлюстраваны ў работах расійскіх і айчынных гісторыкаў М.Д. Далбілава, А.А. Вішлянковай, А.М. Філатавай, В.В. Яноўскай [19–22]. Актыўны ўдзел у навуковай распрацоўцы адзначанай тэматыкі прымаюць і царкоўныя дзеячы [2; 23; 24].

Істотны гістарыяграфічны пласт уяўляюць сабой працы «заходніх» гісторыкаў-русістаў. Не губляюць сваёй актуальнасці выдадзеныя ў 1970–80-я гады манаграфіі Г. Фрыза, прысвечаныя рускаму прыхадскому духавенству [25; 26]. Рознабаковы аналіз імперскай канфесійнай палітыкі змяшчаецца ў працах П. Верта, Р. Круза, А. Капэлера [27–30]. Грамадскія спрэчкі аб прынцыпах арганізацыі і кіравання царкоўным жыццём у познаімперскай Расіі асвятляюцца ў манаграфіі амерыканскага гісторыка В. Шаўцовай [31].

Фарміраванне «канфесійнай дзржавы» ў Расіі. Пятроўская мадэрнізацыя заклала пачатак фарміравання «well-ordered police state» (тэрмін М. Раева), ці «рэгулярнай» дзяржавы эпохі Новага часу ў Расіі. Ва ўмовах «рэгулярнай» дзяржавы цывільная ўлада пераходзіла з пазіцыі параўнальна пасіўнага «наглядчыка» над падданымі да інтэрвенцыяналісцкай, крэатыўнай рэгламентацыі сацыяльных адносін і культурнага асяроддзя, да ўладкавання «агульнага дабрабыту» [20, с. 42].

Сфера рэлігійнага жыцця грамадства займала адно з цэнтральных месцаў у сацыякультурнай прасторы імперыі. У сувязі з гэтым распачатая Пятром I рэгламентацыя прававога становішча рэлігійных аб'яднанняў была скіравана на пераўтварэнне канфесій у механізм «сацыяльнага дысцыплінавання», законапаслухмянасці і падначалення «рэгулярнай» дзяржаве [20, с. 45]. Прыналежнасць да той ці іншай прызнанай дзяржавай канфесіі апасродкавала грамадзянскія адносіны падданых да дзяржавы і з'яўлялася для апошняй інструментам кіравання, кантролю і катэгарызацыі насельніцтва. Такім чынам, улада прызнавала наяўнасць разнастайных канфесій у дзяржаве не таму, што кіравалася прынцыпам самакаштоўнасці кожнай з іх, а таму, што падтрыманне адрозненняў паміж імі дапамагала выхоўваць у падданых законапаслухмянасць і ўсведамленне сваёй функцыі і месца ў грамадстве. Зыходзячы з гэтай дэфініцыі, Р. Круз у сваім даследаванні назваў Расію «канфесійнай дзяржавай» [20, с. 42; 33].

Першай у імперыі канфесіяй, якая зведала на сабе эксперыменты інжынерыі «канфесійнай дзяржавы», была Руская праваслаўная царква. Фарміраванне спецыфічнага сімбіёзу свецкай бюракратыі і духоўнай улады, распаўсюджанага ў далейшым і на адносіны імперыі з неправаслаўнымі веравызнаннямі, распачалося з ліквідацыі інстытута патрыяршаства і стварэння Найсвяцейшага Сінода.

Арганізацыя вышэйшага кіравання РПЦ. Паводле кананічнага права Праваслаўная царква ўяўляе сабой супольнасць аўтакефальных памесных Цэркваў. Згодна з кананічнымі правіламі асноўнай формай вышэйшага царкоўнага кіравання памеснай Царквой з'яўляецца Памесны Сабор. На Памесным Саборы адбываецца абранне першаіерарха (мітрапаліта, экзарха ці патрыярха) адпаведнай памеснай Царквы. Падчас вырашэння царкоўных спраў першаіерарх дзейнічае не адзінаасобна, а ад імя ўсёй памеснай іерархіі, якая прадстаўлена на Памесным Саборы [2, с. 155]. Першаіерарх РПЦ атрымаў тытул патрыярха ў 1589 г. і з'яўляўся роўным па сане Сусветнаму (Канстанцінопальскаму), Анціахійскаму, Іерусалімскаму, Александрыйскаму патрыярхам.

25 студзеня 1721 г. Пётр I падпісаў Маніфест і «Регламент, или Устав Духовной коллегии». Згодна з

гэтымі дзяржаўнымі заканадаўчымі актамі РПЦ пазбаўлялася сану патрыярха. Пад забаронай апынулася і скліканне Памесных Сабораў, аб якіх Рэгламент увогуле не ўзгадваў [32, с. 314–346]. Гэтак воляй свецкага манарха кардынальна змянялася кананічнае ўладкаванне Царквы. Быў зруйнаваны асноўны прынцып кананічнай структуры праваслаўнага ладу – саборнасць. Замест Памеснага Сабора і пасады патрыярха ствараўся новы орган кіравання – Духоўная калегія. Згодна кананічным нормам (131 навела імператара Юсцініяна), любы дзяржаўны закон, які пярэчыць канонам, губляў сваю сілу [2, с. 28]. Аднак у іерархаў РПЦ не заставалася іншага выбару, як падначаліцца новым рэаліям пятроўскага Polizeistaat.

Кульмінацыяй царкоўнай рэформы сталася прызнанне расійскага імператара кіраўніком РПЦ. Пятроўская канцэпцыя самадзяржаўя прадугледжвала ўсталяванне вярхоўнай улады манарха над Царквой як над адным з найбольш уплывовых інстытутаў грамадства. Сярод важнейшых прычын ліквідацыі сану патрыярха складальнік Рэгламенту Ф. Пракаповіч называў небяспеку ўсталявання двоеўладдзя ў дзяржаве (свецкі манарх versus патрыярх). У «Духоўным рэгламенце» прама адзначалася, што «Коллегиум правительственное под державным монархом есть и от монарха установлено» [32, с. 314]. У прысягу для членаў Калегіі ўводзілі наступныя словы: «Исповедую же с клятвою крайнего судию Духовной сей Коллегии быти самого Всероссийского монарха государя нашего Всемилостивейшего» [32, с. 315].

Главенства імператара над РПЦ у поўнай меры было адлюстравана ў «Своде законов Российской империи» (1832 г.). Расійскі імператар не мог вызнаваць ніякай іншай веры, акрамя праваслаўнай [33, арт. 41]. Закон прадпісваў ажыццяўляць каранаванне ўзыходзячага на прастол манарха праз святое мірапамазанне па абрадзе Праваслаўнай царквы (арт. 35). У артыкуле 42 «Основных государственных законов» адзначалася: «Император, яко Христианский Государь, есть верховный защитник и хранитель догматов господствующей веры и блюститель правоверия и всякого в Церкви святой благочиния». У заўвазе да гэтага артыкула гаварылася: «В сем смысле Император в акте о наследии Престола именуется Главою Церкви» [33, с. 10]. Артыкул 43 занатоўваў, што імператар ажыццяўляў кіраванне Праваслаўнай царквой «посредством» Найсвяцейшага Сінода [33, арт. 43]. Гэтыя нормы сведчылі аб тым, што правы самадзяржаўнай улады датычыліся, перш за ўсё, пытанняў царкоўнага кіравання, а не дагматычных і абрадавых бакоў веравызнання. У той жа час, як адзначыў С.В. Рымскі, ва ўмовах, калі Царква была пазбаўлена патрыяршага праўлення, гэткая формула мела «двухсэнсоўны» характар, ставіла свецкую асобу над усёй Царквой і замацоўвала за манархам ролю вышэйшага аўтарытэта ў справах праваслаўя [12, с. 34].

Архіепіскап Ф. Пракаповіч пісаў: «Христианские государи могут нарещися не только епископами, архиереями, но и епископами епископов» [34]. Прафесар-кананіст М. Суораў вызначаў наступныя паўнамоцтвы імператара як кіраўніка РПЦ: права склікання Сабора, вызначэнне пытанняў, якія павінны разглядацца на Саборы, зацвярджэнне саборных пастановаў, вярхоўны нагляд, зацвярджэнне на вышэйшыя духоўныя пасады [3, с. 229–230]. Усе пастановы Сінода да 1917 г. выходзілі са штэмпелем «По указу Его Императорского Величества» [2, с. 167].

Першае пасяджэнне наваствораной Духоўнай калегіі адбылося 21 лютага 1721 г. Падчас гэтага пасяджэння Калегія і была перайменавана ў Найсвяцейшы Сінод. На працягу XVIII–XIX стст. склад Сінода неаднаразова трансфармаваўся. У познаімперскі перыяд Сінод складаўся з «першапрысутнага» члена (звычайна гэту пасаду займаў мітрапаліт Санкт-Пецярбургскі); членаў (епархіяльных архірэяў, якія пажыццёва прызначаліся ўказам імператара); прысутных (архірэяў, якія прызначаліся імператарам на пэўны тэрмін, «впредь до объявления высочайшей воли о возвращении их в свои епархии»). Ні члены, ні прысутныя не вызваляліся ад абавязкаў па кіраванні епархіямі. Аднак выезд гэтых іерархаў з Пецярбурга для наведвання сваіх епархій ажыццяўляўся толькі з дазволу імператара [10].

Сінод з'яўляўся вышэйшай адміністрацыйнай і судовай інстанцыяй РПЦ. Ён надзяляўся наступнымі паўнамоцтвамі: 1) стварэнне новых епіскапскіх кафедр, прызначэнне іерархаў на вакантныя кафедры (са згоды імператара); 2) вярхоўнае назіранне за выкананнем царкоўных законаў усімі членамі Царквы, за духоўнай асветай прыхаджан; 3) хадайніцтва праз асобу обер-пракурора перад «вярхоўнай уладай» аб патрэбах РПЦ; 4) усталяванне новых царкоўных святаў

і абрадаў, кананізацыя святых; 5) выданне духоўнай літаратуры; 6) цэнзураванне сачыненняў багаслоўскага, царкоўна-гістарычнага і кананічнага зместу; 7) як вышэйшая царкоўная судовая ўлада, Сінод з'яўляўся судом першай інстанцыі па абвінавачваннях епіскапаў у антыкананічных учынках і апеляцыйнай інстанцыяй па справах, што вырашаліся ў епархіяльных судах; 8) вынясенне канчатковых рашэнняў па шлюбаразводных справах, а таксама па справах па пазбаўленні духоўных асоб сана і аб накладанні анафемы на свецкіх асоб; 9) ажыццяўленне кананічных зносін РПЦ з аўтакефальнымі Праваслаўнымі цэрквамі [2, с. 167–168].

У 1722 г. указам імператара была ўсталявана пасада обер-пракурора Сінода. Згодна з Інструкцыяй обер-пракурора на гэтую пасаду павінны былі прызначацца афіцэры. Обер-пракурор абвяшчаўся «оком государя и стряпчим по делам государственным». На працягу XIX ст. паўнамоцтвы обер-пракурора істотна пашырыліся: з чыноўніка, які кантраляваў вядзенне сінадальных спраў (што было прадугледжана ў Інструкцыі), ён стаў паўнамоцным міністрам (з 1865 г.) і членам Камітэта міністраў (з 1880 г.). З 1802 г. Сінод быў пазбаўлены права прамых зносін з вышэйшымі дзяржаўнымі ўстановамі і мог звяртацца да іх толькі праз обер-пракурора. Як дзяржаўны саноўнік, обер-пракурор меў намесніка – таварыша обер-пракурора (з 1865 г.) і канцылярыю (з 1839 г.), аналагічную міністэрскім дэпартаментам. Акрамя канцылярыі обер-пракурора, існавала і канцылярыя Найсвяцейшага Сінода, аднак і яна падначальвалася обер-пракурору [3, с. 230–231; 11; 35, с. 11–16].

Епіскап Енісейскі і Краснаярскі Нікадзім (Казанцаў) у 1873 г. у сваіх запісках «О Святейшем Синоде» пісаў: «Обер-прокурор, олицетворяющий собою светскую власть в Синоде, с одной стороны, есть ничто в Синоде, потому что не имеет голоса в нем; но с другой стороны, он же есть всё в Синоде, потому что в его полном распоряжении состоят: 1) письменное производство дел Синода; 2) сношения Синода со всеми государственными властями, со всеми архиереями и всем духовенством; 3) представление синодальных дел государю и принятие повелений государя Синоду. Одно это есть всё. Посему члены Синода суть как птицы без крыльев, как машина, движущаяся стороннею пружиною; образ и вид власти без самой власти, призрак её, а не жизнь. Синод рассуждает о делах как бы на площади, под наблюдением и угрозою сторонней власти» [36].

Епархіяльнае кіраванне. Паводле норм кананічнага права, епархія – гэта частка Сусветнай і Памеснай царквы, на чале якой знаходзіцца епіскап. Епіскапы – пераемнікі апосталаў, якія праз шэраг пасвячэнняў маюць боскую сувязь з апошнімі, архіпастыры, першасвяшчэннікі і вышэйшыя настаўнікі сваіх Цэркваў [2, с. 97].

Кананічны парадак абрання епіскапаў канстытуяваны ў «Дзеяннях святых Апосталаў» (I, 15–26), 4-м правіле Першага Сусветнага Сабора, 3-м правіле Сёмага Сусветнага Сабора. Гэтыя правілы патрабавалі, каб абранне епіскапа ладзілася на Саборы, у якім удзельнічалі ўсе епіскапы рэгіёна. Адсутныя на Саборы архірэі павінны былі перадаць свой голас у пісьмовай форме. Епіскап лічыўся абраным, калі за яго прагаласавала большасць з ліку галасаваўшых. Паводле 19-га правіла Анціахійскага Сабора, прызначэнне епіскапа, якое адбылося насуперак зазначанаму кананічнаму парадку, прызнавалася несапраўдным [37, с. 68].

Пасля пятроўскай рэформы кананічны парадак абрання епіскапаў у Расіі быў ліквідаваны. «Духоўны рэгламент» вызначаў наступны парадак прызначэння епархіяльных архірэяў: Сінод прапаноўваў дзве кандыдатуры (з 1822 г. – тры) на разгляд імператара, манарх «высочайше повелевал» аднаму з іх (як правіла, першаму са спісу кандыдатаў) «быць епіскапам» [35, с. 101].

Яшчэ да прыняцця «Духоўнага рэгламента» ў 1716 г. быў складзены новы змест клятвы, якую прамаўлялі архірэі перад хіратаніяй (пасвячэннем у духоўны сан). Акрамя традыцыйных кананічных абяцанняў прытрымлівацца царкоўных запаветаў, святых канонаў, ахоўваць царкоўную згоду, кіраваць паствай з «евангельскай рахманасцю» і выказваць паслухмянасць вышэйшай царкоўнай уладзе, у тэкст клятвы былі ўключаны наступныя абяцанні: нікому не абвяшчаць анафему і не адлучаць ад царквы «па асабістых прычынах»; «с отпавшими поступать миролюбиво, кротко и благоразумно», манахаў «трымаць» па ўсёй строгасці манаскіх статутаў; не будаваць цэркваў і не прызначаць царкоўнаслужыцеляў «без патрэбы»; штогод ці адзін раз

на два гады аглядаць сваю епархію; «мёртвых тел, формально не освидетельствованных, не выдавать за святые мощи»; «притворно беснующихся (кликуш) наказывать духовными мерами и предавать светской власти»; «не допускать вымышленных чудес от икон и источников»; не ўмешвацца ў свецкія справы [2, с. 200–201]. Па сутнасці, епіскап браў на сябе функцыі агента грамадзянскіх улад у сферы секулярызацыі грамадскага жыцця, у барацьбе з празмернай рэлігійнасцю кліра і паствы, «прымхамі» і «забабонамі», уласцівымі «народнаму» праваслаўю.

Пацвярджэннем інтэграванасці епіскапату ў адміністрацыйна-бюракратычны апарат імперыі з'ўлялася шырока распаўсюджаная ў Расіі практыка перамяшчэння епіскапаў з епархіі ў епархію. Згодна з кананічным правам (14-е Апостальскае правіла), перавод епіскапа з адной епархіяльнай кафедры на другую з'яўляўся недапушчальным [37, с. 68]. У Расійскай імперыі сістэма перамяшчэння епіскапаў шырока выкарыстоўвалася імператарам і вышэйшай царкоўнай бюракратыяй як механізм для ўзнагароджвання лаяльных уладам іерархаў ці, наадварот, пакарання непажаданых. У перыяд з 1764 па 1867 г. усе праваслаўныя епархіі імперыі падзяляліся на тры класы: епархіямі трэцяга класа кіравалі епіскапы, другога – архіепіскапы, першага – мітрапаліты. Такім чынам, пажаданы для ўлад архірэй меў магчымасць прасоўвання па лесвіцы духоўнай іерархіі. Як адзначыў С.В. Рымскі, паступовасць прасоўвання ў ступенях архірэйскага служэння выконвалася гэтак жа строга, як і ў грамадзянскім ведамстве [12, с. 69]. Павышэннем лічыўся нават перавод у епархію роўнага класа, калі яна размяшчалася бліжэй да цэнтра еўрапейскай Расіі. У сярэднім архірэй за час свайго служэння змяняў 3 кафедры, а кожная з епархій праз кожныя 7 гадоў атрымлівала новага ўладыку [12, с. 69–70].

З часоў праўлення Кацярыны II межы праваслаўных епархій у імперыі, як правіла, адпавядалі межам губерняў. Такім чынам грамадзянскія ўлады забяспечвалі дадатковы кантроль над Царквой і разлічвалі на ўзгадненне дзеянняў духоўнай і свецкай улады. Усяго ў другой палове XIX ст. у Расійскай імперыі налічвалася 56 епархій. У 1900 г. была створана новая – Гродзенская епархія [22, с. 19].

Губернатары, а тым больш і генерал-губернатары, як непасрэдныя прадстаўнікі манарха ў адміністрацыйнай акрузе, адчувалі сваю перавагу над епіскапамі, разглядалі іх як чыноўнікаў па «ведамству праваслаўнага веравызнання». У адміністрацыйнай практыцы было цалкам дапушчальным, што ў справаздачах і рапартах губернатараў утрымлівалася ацэнка дзейнасці духавенства і епархіяльных улад. Падобная ж ацэнка дзейнасці губернатараў для царкоўных іерархаў была недапушчальная [12, с. 72]. Прывядзём толькі некаторыя прыклады. Архіепіскап Іркуцкі і Нерчынскі Ірыней (Несцяровіч) (1831–1864 гг.), актыўны працаўнік умяшальніцтва свецкіх улад у справы духавенства, намаганнямі генерал-губернатара Усходняй Сібіры А.С. Лавінскага быў прызнаны звар'яцелым, зрынуты з кафедры і адпраўлены ў манастыр [12, с. 72]. Віленскі генерал-губернатар Э.Т. Баранаў у канфідэнцыяльным пісьме да обер-пракурора Сінода Д.А. Талстога ў 1867 г. пісаў аб неабходнасці зняць Мінскага архіепіскапа Міхаіла. Верагодна, прычынай такога звароту былі прапольскія сімпатыі іерарха. Аднак у лісце да обер-пракурора Баранаў скардзіўся на «слабое смотрение» архіепіскапа за духавенствам, «происходящ[ее] от преклонности лет Преосвященного Михаила». Неўзабаве, 23 студзеня 1868 года, архіепіскап Міхаіл быў звольнены на спачын у Жыровіцкі манастыр [20, с. 437].

Згодна з кананічным правам епархіяльны архірэй з'яўляўся вышэйшай інстанцыяй у епархіі. Яму належала поўная ўлада над духавенствам і паствай у справах веры. Таму абмежаванне адзінаўладдзя епіскапа ў епархіі з'яўлялася адной з галоўных тэндэнцый у канфесійнай палітыцы «рэгулярнай» дзяржавы. Так, у «Духоўным рэгламенце» змяшчаўся раздзел «аб справах епіскапа», які ўтрымліваў 15 правіл аб кіраванні і «аб'ездах» епархій, адносінах да падначаленага духавенства, епархіяльным судзе і стаўленні да епіскапскіх слуг. Дакумент падкрэсліваў, што епіскап падначальваецца юрысдыкцыі Найсвяцейшага Сінода. Архірэй штогод дасылаў у Сінод дзве справаздачы аб стане епархіі. Аб неадкладных справах епіскап абавязваўся паведамляць тэрмінова [32, с. 322–325].

З IV ст. Праваслаўнай царкве вядомы інстытут вікарных епіскапаў. Асобныя кафедры вікарных архірэяў, г.зн. намеснікаў епіскапаў, ствараліся для дапамогі архірэю ў кіраванні вялізнымі і шматлюднымі епархіямі [2, с. 199]. У Старажытнай Русі вікарыяцтвы адсутнічалі. Першы вікарны епіскап з'явіўся ў Расіі ў 1708 г. Толькі з другой паловы XIX ст. вікарыяцтва атрымала ў імперыі адносна шырокае распаўсюджванне [3, с. 240; 35, с. 112–125].

Кананічнае права прадугледжвала і штат памочнікаў епіскапаў у кіраванні епархіяй. Гэтак, у канонах (Гаргр. 7, 8; Феаф. 10; IV Сусв. 2, 3, 23, 25, 26) знайшлі сваё замацаванне прэсвітэрскія саветы – прэсвітэрыумы. Напрыклад, сярод службовых асоб Канстанцінопальскага прэсвітэрыума былі эканом; сакеларый, які загадваў манастырскімі справамі; хартафілакс – ахоўнік афіцыйных дакументаў, і іншыя. Усе гэтыя службовыя асобы павінны былі быць прэсвітэрамі (свяшчэннікамі) ці дыяканамі [2, с. 199]. Своеасаблівыя прэсвітэрыумы існавалі і ў Старажытнай Русі: епархіяльнае духавенства збіралася ў г.зв. саборную нядзелю на «саборыкі», дзе абмяркоўваліся важнейшыя царкоўныя справы. Аднак ужо ў эпоху патрыяршаства кананічны прынцып кіравання епархіяй, згодна з якім памочнікамі епіскапа былі выключна духоўныя асобы, парушыўся. У епархіях ствараліся прыказы духоўных спраў і казённыя прыказы. Персанал гэтых прыказаў складаўся з духоўных і свецкіх асоб [2, с. 200]. На пачатку сінадальнага перыяду ўстановы, якія дапамагалі архірэю ажыццяўляць кіраванне епархіяй, мелі розныя назвы: духоўныя прыказы, духоўныя архірэйскія канторы, духоўныя праўленні, дэкастэрыі. З 1744 г. усе калегіяльныя ўстановы па кіраванні епархіямі атрымалі аднолькавую назву – кансісторыі [2, с. 201; 40].

У 1841 г. па прадстаўленні обер-пракурора Сінода М.А. Пратасава імператар Мікалай I падпісаў «Устав духовных консисторий», які дэталёва рэгламентаваў кампетэнцыю духоўных кансісторый. У 1883 г. Статут быў выдадзены ў новай рэдакцыі з нязначнымі праўкамі. Такім чынам, на падставе секулярнага дзяржаўна-прававога акта епархіяльныя ўпраўленні ў Расійскай імперыі атрымалі адзіную прававую базу.

У артыкуле 1 Статута адзначалася: «Духовная консистория есть присутственное место, через которое, под непосредственным начальством епархиального архиерея, производятся управление и духовный суд в поместном пределе Православной Российской Церкви, именуемом епархиею» [38, с. 1]. Вышэйшай інстанцыяй для кансісторыі быў Найсвяцейшы Сінод [38, арт. 2].

Кансісторыя складалася з «присутствия» і канцылярыі. У «присутствие» ўваходзіла 5–7 членаў – прадстаўнікоў белага і чорнага («манаствуючага») духавенства. Прызначаліся яны і звальняліся Сінодам па прадстаўленні епархіяльнага архірэя [38, арт. 282]. Для вядзення справаводства пры кансісторыі працавала канцылярыя на чале са свецкім чыноўнікам – сакратаром. Сакратар прызначаўся Найсвяцейшым Сінодам па прапанове обер-пракурора. Астатнія служачыя канцылярыі прызначаліся і звальняліся кансісторыяй «с утверждения» архірэя. Артыкул 287 Статута вызначаў статус сакратара: «Секретарь консистории, находясь под ближайшим начальством епархиального архиерея, состоит вместе с тем в непосредственном ведении обер-прокурора Св. Синода, как блюстителя за исполнением законных постановлений по духовному ведомству, и обязан исполнять все его предписания» [38, с. 106]. Гэтак, нягледзечы на фармальнае падначаленне сакратара епіскапу, першы з'яўляўся асабістым прадстаўніком обер-пракурора, меў права напрамую звяртацца да свайго сталічнага начальніка. Такім чынам забяспечваўся кантроль обер-пракурора над ходам спраў у епархіях.

«Присутствие» кансісторыі мела наступныя адміністрацыйныя паўнамоцтвы: падбор і характарыстыка кандыдатаў на царкоўныя пасады (арт. 67–69), выдача дазволаў на пастрыжэнне ў манахі (арт. 82), нагляд за вядзеннем царкоўнай дакументацыі (метрычных, спавядальных кніг і г.д.) (арт. 99–109), кіраванне архірэйскім домам і яго маёмасцю (арт. 110–123), кіраванне манастырамі (арт. 124–137) і храмамі (арт. 38–65; 138–157). Акрамя таго, кансісторыя выконвала функцыі царкоўнага суда [38, арт. 158; 43].

Епархіяльны архірэй не прымаў удзелу ў пасяджэннях кансісторыі. У той час як сакратар

Hrahotski A.P., **e-mail: grahocki@mail.ru**

з'яляўся абавязковым удзельнікам пасяджэнняў. Ён дакладваў сутнасць справы, даваў неабходныя даведкі і тлумачэнні. Такім чынам, епіскап толькі разглядаў і візаваў ужо гатовыя «определения». Архірэй меў права вярнуць справу на паўторны разгляд. Калі пасля паўторнага разгляду кансісторыі епіскап не пагаджаўся з яе рашэннем, архірэй меў права вынесці ўласную рэзалюцыю, якая лічылася канчатковай [38, арт. 333]. Аднак аб такіх выпадках кансісторыя абавязвалася паведамляць Сіноду і обер-пракурору [12, с. 79].

Гэтак усе рашэнні архірэя праходзілі праз папярэдні разгляд кансісторыі. Статут ператвараў кансісторыю з дапаможнага органа па кіраванні епархіяй у наглядчыка, што абмяжоўваў уладу архірэя, гэта значыць «Устав духовных консисторий» уступаў у пярэчанне з кананічным правам.

Царкоўныя акругі – благачынія. Дзеля аптымізацыі архірэйскага кіравання кананічнае права прадугледжвала дзяленне епархій на царкоўныя акругі. У старажытнай царкве (з IV ст.) царкоўныя акругі ўзначальвалі прызначаныя епіскапам перыядэўты. Пазней на месцы перыядэўта ўзнікла пасада пратапопа [2, с. 199]. У Старажытнай Русі мясцовы нагляд за духавенствам па асобных акругах, на якія падзялялася епархія, ажыццяўляўся намесніка мі, дзесяцільнікамі і папоўскімі старастамі [2, с. 200]. У сінадальны перыяд царкоўныя акругі атрымалі назву благачынія. У 1698 г. патрыярхам Адрыянам была выдадзена «Инструкция поповским благочинным смотрителям». У 1775 г. Цвярскі архіепіскап Платон (будучы мітрапаліт Маскоўскі) на падставе інструкцыі Адрыяна склаў «Инструкцию благочинных приходских церквей». Гэтая інструкцыя была зацверджана Сінодам і абвешчана абавязковай для ўсіх епархій імперыі [2, с. 202]. У 1857 г. у інструкцыю былі ўнесены змены і дапаўненні, у 1892 г. яна была выдадзена ў новай рэдакцыі.

У адпаведнасці з інструкцыяй благачынныя прызначаліся і звальняліся непасрэдна архірэем з ліку прыходскіх настаяцеляў адпаведнай акругі [35, с. LXI]. Благачынніцкія акругі складаліся з 10–30 прыходаў. Калі ў адным благачыніі было больш за 15 прыходаў, архірэй мог прызначыць памочніка благачыннага [38, арт. 69]. Гэтак, па стане на 1861 г., у імперыі налічвалася 2486 благачыній і 31 136 прыходаў [40, с. 34].

На благачыннага ўскладаліся наступныя абавязкі: 1) нагляд за арганізацыяй прыходаў: правяраў правільнасць уладкавання алтара, іканастаса, наяўнасць царкоўных рэчаў («утвари»), духоўнай літаратуры, тэхнічны стан храмаў і царкоўных пабудоў, добраўпарадкаванасць тэрыторыі вакол цэркваў; сачыў за будаўніцтвам новых храмаў, прытокам і адтокам прыхажан у прыходах; 2) кантроль за жыццядзейнасцю прычта: сачыў за паводзінамі царкоўна- і свяшчэннаслужыцеляў, членаў іх сямей (каб яны «... жили честно, степенно, кротко, мирно и в исполнении своей должности были благоговейны»), рэгулярнасцю адпраўлення літургій і іх адпаведнасцю кананічным правілам; адказваў за вырашэнне канфліктаў паміж членамі прычта; ажыццяўляў кантроль за паўсядзённым жыццём духавенства: благачынны абавязваўся сачыць за асабістымі кантактамі духавенства (да каго клірыкі ходзяць у госці і каго прымаюць у сябе дома), якую літаратуру яны чытаюць, якую носяць вопратку; сачыў за неўмяшальніцтвам духавенства ў свецкія справы; даваў дазвол на перамяшчэнне свяшчэннікаў у межах епархіі; адказваў за вопіс і перадачу царкоўнай маёмасці і дакументацыі ад аднаго святара да другога; кантраляваў правільнасць вядзення царкоўнай дакументацыі, спавядальных і метрычных кніг, а таксама ўладкавання царкоўнага архіва; сачыў за дзейнасцю царкоўных стараст. Дзеля выканання сваіх абавязкаў благачынныя павінны былі наведваць даручаныя ім прыходы два разы на год. Па выніках праверак яны складалі рапарт на імя епархіяльнага архірэя [35, с. XLVIII–LXI].

Акрамя таго, благачыннымі складаліся так званыя фармуляры – кліравыя ведамасці, у якіх давалася ацэнка паводзінаў кожнага клірыка за год, пазначаліся праступкі і штрафныя санкцыі, калі яны мелі месца. Менавіта паводле гэтых фармуляраў «епархіяльнае начальства» рабіла вывады аб дабранадзейнасці падначаленых духоўных асоб [12, с. 83–84].

Такім чынам, на благачынных, якія з'яўляліся пасярэднікамі паміж епархіяльным архірэем і прыходскім духавенствам, ускладаўся шэраг секулярных функцый, звязаных з дысцыплінаваннем духавенства (дазвол на перамяшчэнне, кантроль за ладам жыцця, прадухіленне распаўсюджвання «прымхаў» і «забабонаў» сярод кліру) і ажыццяўленнем апошнімі адміністрацыйна-бюракратычных паўнамоцтваў (кантроль за метрыкацыяй нараджэнняў, шлюбаў, смерцяў прыхаджан, фіксацыяй споведзяў і г.д.).

У эпоху «Вялікіх рэформ» паўстала пытанне аб абранні благачынных духавенствам адпаведнай царкоўнай акругі [12; 40]. На нашу думку, гэтая ініцыятыва цалкам адпавядала стратэгіі «рэгулярнай» дзяржавы, скіраванай на паслабленне адзінаўладдзя епіскапаў: выбарнасць пасады благачыннага істотна паслабляла залежнасць апошняга ад епархіяльнага архірэя. Аднак спецыяльнага ўнутрыцаркоўнага дакумента аб выбарах благачынных так і не выйшла. Гэта пытанне было пакінута на меркаванне епархіяльных архірэяў.

Гэтак у 1864 г. выбары благачынных ажыццяўляліся ў Саратаўскай і Архангельскай епархіях. У 1866 г. – у Арлоўскай, Кіеўскай, Смаленскай і некаторых іншых. У шэрагу епархій архірэі прызначалі благачынных са спісу двух-трох кандыдатаў, прапанаваных кансісторыяй [12, с. 464]. У гэты ж час у епархіях пачалі ўтварацца благачынныя з'езды і благачынныя саветы [12, с. 466; 37, с. 69, 77–80].

У 1881 г. з пачаткам ажыццяўлення кансерватыўнага курсу обер-пракурора К.П. Пабеданосцава ўказам Сінода выбарнасць благачынных была адменена. Фактычна прыпынілася і дзейнасць благачынных з'ездаў і саветаў [36].

Прыходы. Апошнім звяном адміністрацыйнай структуры РПЦ з'яўляліся прыходы і манастыры. У гэтым артукуле мы не разглядаем прававы статус манастыроў у Расійскай імперыі, пакідаючы за сабой магчымасць асобнага разгляду гэтай тэматыкі.

Вядомы кананіст дарэвалюцыйнай Расіі прафесар І.С. Берднікаў даў наступнае вызначэнне прыходу: «Церковным приходом в Православной церкви называется община, имеющая особый храм для богослужебных собраний и состоящая под духовным управлением приходского священника. Приход составляет нераздельную часть епископии и подчинён епископу как высшему своему пастырю. Ближайшее же пастырское руководство им принадлежит, по поручению епископа, местному священнику» [2, с. 215].

Згодна з кананічным правам служэнне прыходскага святара распаўсюджваецца на адну прыходскую абшчыну. Свае пастырскія абавязкі ён выконвае як асоба, упаўнаважаная епіскапам праз здзяйсненне таінства рукапалажэння. У межах прыхода прыходскі свяшчэннік мае паўнату пастырскай духоўнай улады. Без яго дазволу ніякі іншы свяшчэннік не мае права адпраўляць богаслужэнне ў яго прыходскім храме [2, с. 210]. Памочнікамі прыходскога свяшчэнніка з'яўляюцца дыяканы і царкоўнаслужыцелі (дзячкі, панамары).

У Старажытнай Царкве істотнае значэнне для рукапалажэння епіскапам кандыдата ў прыхадскія свяшчэннікі мела меркаванне прыхаджан. Папярэдне епсікап мусіў заслухаць водгукі свайго кліра і свецкіх асоб аб кандыдаце на свяшчэнства. У Старажытнай Русі кандыдат на царкоўнае месца альбо абіраўся прыхаджанамі, альбо прызначаўся свецкім феадалам, калі храм знаходзіўся на яго зямлі. Пасля гэтага кандыдат накіроўваўся да епархіяльнага архірэя для здзяйснення рукапалажэння. Аднак канчатковае рашэнне заставалася за архірэем [2, с. 211–213].

З пачатку XVIII ст. выбары кліра прыхаджанамі паступова пачалі абмяжоўвацца, пакуль у 1797 г. Сінод, спасылаючыся на ўказ імператара аб забароне падаваць калектыўныя «чалабітныя», забараніў калектыўныя прашэнні прыхаджан аб прызначэнні ім святара [42, с. 101]. Згодна з «Уставом духовных консисторий» падбор кандыдатур на тыя ці іншыя свяшчэнна- і царкоўнаслужыцельскія пасады ажыццяўляла духоўная кансісторыя. Пасля чаго кандыдатуры разглядаліся епархіяльным архірэем, які і прымаў рашэнне аб рукапалажэнні ў свяшчэнны сан [38, арт. 74]. Такім чынам, праз духоўную кансісторыю свецкія ўлады маглі ўплываць на выбар архірэя і не дапускаць пасвячэння «недабранадзейных» кандыдатаў. Аднак, як правіла, пасля смерці прыходскага свяшчэнніка на духоўную кафедру прызначаўся яго старэйшы сын, якога бацька загадзя рыхтаваў у пераемнікі. Калі ў святара не было сыноў, дык месца перадавалася па жаночай лініі і даставалася мужу дачкі. Калі ж дзеці былі малалетнімі, згодна з указам Сінода 1767 г., у прыход прызначаўся вікарый, які займаў пасаду да паўналецця дзяцей [42, с. 101; 43, с. 165–166].

Такая практыка прызначэння сведчыла аб саслоўнай замкнёнасці праваслаўнага духавенства. У сілу шэрагу прычын, высвятленне якіх не ўваходзіць у межы нашага даследавання, у XVIII ст. прыходскае духавенства набыло такую важную прыкмету саслоўя, як наследаванне сацыяльнага статуса і прафесіі [43, с. 98–110]. Наследаванне прыходаў з'яўлялася грубейшым парушэннем

кананічнага права. Аднак гэты феномен быў своеасаблівым механізмам сацыяльнай абароны саслоўя, што прымушала царкоўныя ўлады мірыцца з неканапічнай спадчыннай практыкай [43, с. 100; 12, с. 109].

Натуральны прырост духоўнага саслоўя змушаў урад да правядзення так званых разбораў, падчас якіх дарослых дзяцей духавенства, якім не хапіла царкоўных пасад, запісвалі ў іншыя саслоўі. Разборы неаднаразова ажыццяўляліся ў XVIII ст., у 1808, 1831 гг. Аднак гэтыя меры толькі часова вырашалі праблему, вельмі хутка замкнёнасць духавенства зноў вяла да «разбухання» саслоўя [12, с. 105; 43, с. 164].

Канчаткова гэта праблема была вырашана царкоўнай рэформай Аляксандра II. Закон ад 26 мая 1869 г. дазволіў дзецям праваслаўнага духавенства свабодна пакідаць духоўнае саслоўе. У той жа час дакумент захоўваў за імі шэраг ільгот і прывілегій, у тым ліку свабоду ад рэкруцкай павіннасці і права паступаць у духоўна-навучальныя ўстановы. Згодна з законам ад 30 красавіка 1871 г. дзеці праваслаўнага духавенства атрымлівалі правы дваран ці ганаровых грамадзян [40, с. 44–45]. Гэтак секулярная рэформа садзейнічала вяртанню Царквы да кананічнага парадку прызначэння настаяцеляў у прыходы. Зразумела, што рэформа не з'яўлялася праявай клопату дзяржавы аб выкананні кананічных правіл, яна была прадыктавана агульнымі тэндэнцыямі мадэрнізацыі імперыі і пабудовы мадэрнага грамадства.

Колькасць праваслаўных храмаў і адпаведна прыходскага духавенства заўсюды знаходзілася ў полі зроку «рэгулярнай» дзяржавы. Яшчэ ў 1711 г. у сваім указе Пётр I, занепакоены празмернай колькасцю праваслаўнага кліру, загадваў прызначаць новых свяшчэннікаў толькі ў тыя прыходы, дзе гэта «надзвычай» неабходна. У 1718 г. выйшаў указ імператара, які забараняў адчыняць дамавыя цэрквы і загадваў зачыніць ужо існуючыя, за выключэннем тых, што належалі царскай сям'і і некаторым дзяржаўным чыноўнікам. Сінод ва ўказе 1722 г. падкрэсліваў, што будаўніцтва новых цэркваў у імперыі можа ажыццяўляцца толькі з яго дазволу [36]. У гэтым жа годзе Сінод рэгламентаваў колькасць свяшчэннікаў у прыходзе: аптымальнай лічылася наяўнасць аднаго святара на 100–150 двароў прыхаджан, двух – на 200–250 двароў і г.д. [12, с. 92]. У 1858 г. епархіяльныя архірэі зноў атрымалі права даваць дазвол на будаўніцтва храмаў [36].

16 красавіка 1869 г. у рамках царкоўнай рэформы выйшаў указ Аляксандра II, які прадугледжваў памяншэнне колькасці прыходаў і прычтаў у імперыі. Такім чынам улады разлічвалі аптымізаваць выдаткі на ўтрыманне прыходаў: за кошт эканоміі сродкаў з ліквідаваных прыходаў планавалася палепшыць матэрыяльнае становішча ўзбуйненых. Сярэдняя па імперыі колькасць прыхаджан на адзін прыход павялічылася з 1600 да 2200 чалавек. Аднак вырашэнне пытання аб тым, якая царква мусіць быць галоўнай, а якая прыпісной, выклікала велізарныя спрэчкі ўнутры епархій [40, с. 44]. Справа ў тым, што гэткія пераўтварэнні парушалі кананічнае права: дзяржава ўмешвалася ў кампетэнцыю епіскапаў, якім належала выключнае права вызначэння межаў прыходаў [2, с. 213].

У час правядзення контррэформ Аляксандра III пастановай Сінода, зацверджанай імператарам 16 лютага 1885 г., епархіяльныя архірэі атрымалі права аднаўляць прыходы, ліквідаваныя згодна з указам ад 16 красавіка 1869 г. [35, с. 361–364].

Паводле кананічных норм, на прыходскага свяшчэнніка ўскладаліся наступныя абавязкі: штодзень служыць ютрань і вячэрню; па нядзельных і святочных днях, а таксама ў Вялікі пост па серадах і пятніцах адпраўляць боскую літургію; ажыццяўляць сталае прапаведаванне ў храме; ахоўваць «богаслужэбныя рэчы»; сачыць за адпаведнасцю літургічнай абраднасці кананічным нормам; хрысціць, спавядаць, вянчаць і хаваць прыхаджан [2, с. 212–213].

Акрамя кананічных, на прыходскі клір быў ускладзены шэраг дзяржаўных абавязкаў. З часоў праўлення Пятра I «рэгулярная» дзяржава пачынае разглядаць прыходскае духавенства як агентаў сацыяльнага дысцыплінавання насельніцтва. Так указ Пятра I 1718 г., які патрабаваў ад прыходскага духавенства штогод прадстаўляць спіс веруючых, якія не спавядаліся, а таксама сумесная пастанова Сінода і Сената аб вядзенні ў прыходах трох ведамасцяў, дзе адзначаліся адпаведна асобы, што прайшлі споведзь, не з'явіліся на споведзь і «отпали в раскол», мелі істотна больш важнае значэнне, чым вылічэнне прыхаджан, якія перайшлі ў «раскол». Рэгістрацыя споведзі і абавязванне прыхаджан

спавядацца мінімум раз на год садзейнічала ўсведамленню веруючымі сваёй прыналежнасці да праваслаўнага веравызнання. Прыналежнасць да канфесіі (не толькі праваслаўнай, але і любой «цярпімай» у імперыі) пачала адыгрываць ролю важнейшага элемента самаідэнтыфікацыі асобы. Такім чынам, адсутнасць веры (паказчыкам чаго быў запіс аб неспавяданні) прыраўноўвалася да палітычнай нелаяльнасці расійскаму імператару, які, у выпадку праваслаўя, з'яўляўся «божым памазаннікам», кіраўніком Царквы [20, с. 46, 51–52].

На прыходскае духавенства былі ўскладзены абавязкі вядзення запісаў актаў грамадзянскага стану: метрыкацыя нараджэнняў, улік шлюбаў, смярцей прыхаджан. Гэты адміністрацыйны абавязак духавенства быў рэгламентаваны ў Зводзе законаў Расійскай імперыі [44, арт. 859–880]. У дадзеным выпадку святар выконваў функцыю кантролю за насельніцтвам. Чалавек нараджаўся, браў шлюб (і разводзіўся), заводзіў дзяцей і паміраў, выконваючы ў кожным з гэтых выпадкаў таінства ці абрад адпаведнага веравызнання. Гэтак падданы быў бачным для дзяржавы настолькі, наколькі прытрымліваўся абраднасці свайго веравызнання [20, с. 42–43]. Акрамя таго, прыходскі свяшчэннік выконваў функцыю рупара грамадзянскіх улад: ён абавязваўся зачытваць у царкве пасля сканчэння службы царскія маніфесты і ўказы, якія выдаваліся са словамі «объявляется всенародно», а таксама і тыя пастановы грамадзянскіх улад, якія падлягалі абнародаванню [35, с. 3].

Важным складнікам функцыяналу прыходскага кліру быў кантроль за лаяльнасцю паствы грамадзянскім уладам: свяшчэннікі абавязваліся даносіць цывільнай адміністрацыі аб «раскольніках», распаўсюджванні «прымхаў» і «забабонаў», сістэматычным ненаведванні прыхаджанамі цэркваў, аб ухіленні ад перапісаў і падаткаў і, галоўнае, аб «открытых на исповеди преднамеренных злодействах» [42, с. 364]. Такім чынам, прыходскі свяшчэннік абавязваўся парушаць таямніцу споведзі, што з'яўлялася не толькі парушэннем кананічных норм, але і найцяжэйшым грахом для святара.

Яскравым пацвярджэннем інкарпарацыі кліра ў імперскі адміністрацыйна-бюракратычны апарат з'яўляецца паступовае на працягу XIX ст. увядзенне выплаты заробкаў прыходскаму духавенству з дзяржаўных сродкаў [12, с. 110; 41, с. 191]. Прыходскае святарства прыпадабнялася дзяржаўным чыноўнікам і магчымасцю скласці свяшчэнны сан, што з'яўлялася парушэннем кананічнага права. Клірык, які жадаў скласці свяшчэнства, падаваў прашэнне ў Сінод. Калі Сінод задавальняў яго, адзілася цырымонія складання сану, духоўная асоба пазбаўлялася «стаўленай граматы». Гэтая некананічная працэдура легалізавалася ва ўказе Мікалая I (1833 г.) [12, с. 101–102, 459].

Не адпавядала кананічным нормам і распаўсюджаная ў імперыі практыка перамяшчэння клірыкаў з прыхода ў прыход. Згодна з кананічным правам, перавод свяшчэнна- ці царкоўнаслужыцеля ў іншы прыход дазваляўся толькі ў «выключных выпадках» [2, с. 214]. Як адзначае М.Д. Ізвекаў, паступленне прашэнняў ад прыходскага кліру аб пераводзе іх у іншыя прыходы было звычайнай справай у кансісторскім справаводстве. Так, мітрапаліт Літоўскі Іосіф (Сямашка) у 1853 г. нават быў вымушаны зрабіць распараджэнне, згодна з якім клірыкам дазвалялася прасіць аб пераводзе толькі пасля 10 гадоў службы на адным месцы [15, с. 117].

У 1721 г. у прыходах была ўведзена пасада царкоўнага старасты. Згодна з «Инструкцией церковным старостам», зацверджанай імператарам Аляксандрам I 17 красавіка 1808 г., стараста абіраўся тэрмінам на 3 гады з ліку прыхаджан на агульным сходзе ў прысутнасці благачыннага і са згоды прычта. Затым абраная асоба зацвярджалася епархіяльным архірэем. Стараста адказваў за збор добраахвотных ахвяраванняў на карысць царквы, непасрэдна займаўся продажам царкоўных свечак, сачыў за тэхнічным станам царкоўных пабудоў, вёў царкоўную бухгалтэрыю, складаў фінансавыя справаздачы, якія перадаваліся на праверку благачыннаму. На царкоўнага старасту інструкцыя ўскладала і некаторыя паліцэйскія абавязкі: ён сачыў за прытрымліваннем манаполіі на продаж свечак; калі ва ўласнасці царквы меўся лес, стараста наглядаў за выкарыстаннем драўніны (лесаматэрыялы дазвалялася ўжываць толькі на патрэбы храма) [35, с. CVVV–CXXIX]. Такім чынам, і на прыходскім узроўні паўставала свецкая асоба, якая выконвала функцыі нагляду за клірам.

Поруч з пасадай царкоўнага старасты ў час правядзення царкоўнай рэформы Аляксандра II пачалі ствараццa прыходскія папячыцельствы. 2 красавіка 1864 г. імператар падпісаў «Положение о приходских попечительствах при православных церквях». Члены папячыцельства абіраліся з ліку

прыхаджан на агульным сходзе царкоўнай абшчыны. Папячыцельствы павінны былі клапаціцца аб матэрыяльным забеспячэнні прычтаў, займацца зборам сродкаў на дабрачыннасць [35, с. 384–391]. Дадзеная ініцыятыва была скіравана на актывізацыю грамадзянскай актыўнасці і інтэграцыю царкоўных і грамадскіх структур, што адпавядала духу «Вялікіх рэформ». Аднак, у цэлым, прыхаджане не падтрымалі ідэю стварэння прыхадскіх папячыцельстваў, а тыя, што ўтварыліся, не здолелі забяспечыць матэрыяльную падтрымку духавенству і наблізіць яго да народа [23, с. 44].

Заключэнне. З пачаткам пятроўскай мадэрнізацыі ў Расіі распачалося фарміраванне «канфесійнай дзяржавы». Рэгламентацыя прававога статусу рэлігійных аб'яднанняў была заклікана падначаліць канфесіі дзяржаўнай уладзе і інкарпараваць іх адміністрацыйны апарат у бюракратычную структуру імперыі. Першай з прызнаных у дзяржаве канфесій, якая зведала на сабе эксперыменты інжынерыі Polizeistaat, была «господствующая» ў імперыі Руская праваслаўная царква.

Царква пазбавілася свайго вышэйшага кананічнага органа – Паменснага Сабора – і патрыяршага праўлення, кіраўніком РПЦ у расійскім заканадаўстве быў абвешчаны свецкі манарх. На падставе дзяржаўна-прававога акта («Духоўнага рэгламенту») у якасці вышэйшага органа кіравання Царквой быў створаны Найсвяцейшы Сінод, які падначальваўся непасрэдна імператару. Дзейнасць вышэйшага царкоўнага органа была цалкам падкантрольна асобе свецкага чыноўніка – обер-пракурора Сінода.

Секулярнымі прававымі нормамі быў зменены кананічны парадак абрання епіскапату. Епархіяльныя архірэі прыпадабняліся дзяржаўным чыноўнікам, падначаленым губернскім адміністрацыям. Дзяржаўны нарматыўна-прававы акт «Устав Духовных консисторий» быў заклікаць абмежаваць уладу епархіяльных архірэяў. Духоўныя кансісторыі ператвараліся з дапаможнага органа кіравання епархіяй у орган кантролю і нагляду за дзейнасцю епіскапаў. Самі кансісторыі, як і Найсвяцейшы Сінод, былі падкантрольныя свецкім чыноўнікам-сакратарам.

У агентаў сацыяльнага дысцыплінавання насельніцтва свецкае заканадаўства ператварыла прыходскі клір. На свяшчэнна- і царкоўнаслужыцеляў, акрамя кананічных, ускладаліся секулярныя абавязкі па запісе актаў грамадзянскага стану, інфармаванні насельніцтва, ажыццяўленні кантролю за лаяльнасцю паствы цывільнай адміністрацыі і г.д. Шэраг секулярных функцый, звязаных з дысцыплінаваннем духавенства і наглядам за выкананнем клірам дзяржаўных абавязкаў, ускладаўся і на благачынных.

РПЦ пазбавілася статусу аўтаномнага грамадскага інстытута, ператварыўшыся ў «Ведомство православного исповедания». «Аддзяржаўленне» Царквы суправаджалася каардынальнай ломкай яе кананічнага ўладкавання. Дзяржаўнае заканадаўства, якое рэгламентавала адміністрацыйную структуру РПЦ, супярэчыла нормам кананічнага права.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. *Брольо, Ф.М.* Религия и юридические системы. Введение в сравнительное церковное право / Ф.М. Брольо, Ч. Мирабелли, Ф. Онида. – М.: Библейско-богословский ин-т св. апостола Андрея, 2008. – 437 с.

2. *Цыпин, В.А.* Церковное право / В.А. Цыпин. – М.: МФТИ, 1994. – 295 с.

3. *Суворов, Н.* Учебник церковного права / Н. Суворов. – М.: Печатня А.И. Снегирёвой, 1912. – 531 с.

4. *Дробина, М.Г.* Правовое положение русской Православной Церкви в период проведения церковной реформы Петра I: историко-правовой аспект: дис. ... канд. юрид. наук: 12.00.01 / М.Г. Дробина. – Краснодар, 2005. – 192 л.

5. *Дорская, А.А.* Церковное право в системе права Российской империи конца XVIII–начала XX вв.: автореф. дис. ... д-ра юрид. наук: 12.00.01 / А.А. Дорская; Рос. гос. социальный ун-т. – М., 2008. – 40 с.

6. *Гуденица, А.Н.* Правовой статус Русской православной церкви: Нормативно-институциональный аспект: автореф. дис. … канд. юрид. наук: 23.00.02 / А.Н. Гуденица. – Ростов н/Д., 2002. – 25 с.

7. *Залужный, А.Г.* Правовое регулирование и прокурорский надзор в сфере отношений государства и религиозных объединений: дис. … д-ра юрид. наук: 12.00.01, 12.00.11 / А.Г. Залужный. – М., 2005. – 560 с.

8. *Шапошников, Е.Л.* Государственно-церковные отношения в России в XX–начале XXI века. Историко-правовой и общетеоретический анализ: автореф. дис. … канд. юрид. наук: 12.00.01 / Е.Л. Шапошников. – Н. Новгород, 2007. – 24 с.

9. *Петюкова, О.Н.* Правовые формы отношений советского государства и Русской православной церкви в 1917–1945 годах: автореф. дис. … д-ра юрид. наук: 12.00.01 / О.Н. Петюкова; Московская

гос. юрид. акад. им. О.Е. Кутафина. – М., 2011. – 43 с.

10. *Алексеева, С.И.* Святейший Синод в системе высших и центральных государственных учреждений пореформенной России, 1856–1904 / С.И. Алексеева. – 2-е изд. – СПб.: Наука, 2006. – 275 с.

11. *Полунов, А.Ю.* Под властью обер-прокурора / А.Ю. Полунов. – М.: АИРО-XX, 1996. – 141 с.

12. *Римский, С.В.* Российская церковь в эпоху Великих реформ (Церковные реформы в России 1860–1870-х годов) / С.В. Римский. – М.: Крутицкое Патриаршее Подворье, 1999. – 567 с.

13. *Фирсов, С.Л.* Русская церковь накануне перемен (конец 1890-х – 918 гг.) / С.Л. Фирсов. – М.: Духовная библиотека, 2002. – 623 с.

14. *Пулькин, В.М.* Православный приход и власть в середине XVIII–начале XX в. (по материалам Олонецкой епархии) / В.М. Пулькин. – Петрозаводск: Карельский научный центр РАН, 2009. – 422 с.

15. *Бендин, А.Ю.* Вероисповедная система Российской империи (конец XIX – нач. XX в.) / А.Ю. Бендин // VII Международные Кирилло-Мефодиевские чтения, посвящённые Дням славянской письменности и культуры (Минск, 22–24 мая 2001 г.): в 2 ч. / редкол.: А.Ю. Бендин [и др.]. – Минск, 2002. – Ч.1, кн. 1. – С. 153–171.

16. *Бендин, А.Ю.* О содержании понятия веротерпимости накануне указа 17 апреля 1905 г. / А.Ю. Бендин // XI Международные Кирилло-Мефодиевские чтения, посвящённые Дням славянской письменности и культуры (Минск, 24–26 мая 2005 г.): материалы чтений «Социальная миссия Церкви в современном мире» / Ин-т теологии им. Св. Мефодия и Кирилла, Бел. гос. ун-т культуры и искусств; отв. ред. и сост. А.Ю. Бендин. – Минск: Ковчег, 2006. – С. 79–108.

17. *Михайлов, А.Ю.* Вероисповедное законодательство: между «конфессиональным» и «новым культурным» государством / А.Ю. Михайлов // Имперские и национальные модели управления: российский и европейский опыт. – М.: ИВИ РАН, 2007. – С. 449–456.

18. *Михайлов, А.Ю.* Модерное православие: «историзация» и «национализация» государственной религии в Российской империи (1860-е – 1917) / А.Ю. Михайлов // Сравнительное изучение религиозных традиций: Россия, Восточная Европа, постсоветское пространство: сб. статей. – Иваново: ИвГУ, 2010. – С. 81–96.

19. *Вишленкова, Е.А.* Заботясь о душах подданных: религиозная политика в России первой четверти XIX века / Е.А. Вишленкова. – Саратов: Изд-во Саратовского ун-та, 2002. – 467 с.

20. *Долбилов, М.Д.* Русский край, чужая вера: Этноконфессиональная политика империи в Литве и Белоруссии при Александре II / М.Д. Долбилов. – М.: Новое лит. обозрение, 2010. – 1000 с.

21. *Филатова, Е.Н.* Конфессиональная политика царского правительства в Беларуси. 1772–1860 гг. / Е.Н. Филатова. – Минск: Белорус. наука, 2006. – 192 с.

22. *Яноўская, В.В.* Хрысціянская царква ў Беларусі ў 1863–1914 гг. / В.В. Яноўская. – Мінск: БДУ, 2002. – 199 с.

23. *Цыпин, В.* История Русской Православной Церкви. Синодальный и новейший периоды. 1700–2005 гг. / В. Цыпин. – М.: Изд-во Сретенского монастыря, 2006. – 816 с.

24. *Цыпин, В.* Каноническое право / В. Цыпин – М.: Изд-во Сретенского монастыря, 2009. – 864 с.

25. *Freeze, G.L.* The Russian Levites: Parish Clergy in the Eighteenth Century / G.L. Freeze. – Cambridge: Harvard University Press, 1977. – 325 p.

26. *Freeze, G.L.* The Parish Clergy in the Nineteenth-Century Russia: Crisis, Reform, Counter-Reform / G.L. Freeze. – Princeton: University Press, 1983. – 387 p.

27. *Werth, P.* The Institutionalization of Confessional Difference: "Foreign Confessions" in Imperial Russia, 1810–1857 / P. Werth // Defining Self: Essays on Emergent Identities in Russia, Seventeenth to Nineteenth Centuries / Ed. M. Branch. – Helsinki: Finnish Literature Society, 2009. – P. 152–172.

28. *Werth, P.* Schism Once Removed: Sects, State Authority, and Meanings of Religious Toleration in Imperial Russia / P. Werth // Imperial Russia / Ed. by A. Miller and A. Rieber. – Budapest: Central European University Press, 2004. – P. 85–108.

29. *Crews, R.* Empire and Confessional State: Islam and Religious Politics in Nineteenth-Century Russia / R. Crews // American Historical Review. – 2003. – Vol. 108. – № 1. – P. 50–83.

30. *Каппелер, А.* Россия – многонациональная империя: возникновение, история, распад / А. Каппелер. – М.: Традиция – Прогресс – Традиция, 2000. – 344 с.

31. *Шевцова, В.Ф.* Православие в России накануне 1917 г. / В.Ф. Шевцова. – М.: Дмитрий Буланин, 2010. – 488 с.

32. Полное собрание законов Российской империи. Собрание I: в 45 т. – СПб., 1830. – Т. 6. – 815 с.

33. Основные государственные законы // Свод законов Российской империи: в 16 т. – СПб, 1912. – Т. 1.

34. *Карташёв, А.* Очерки по истории русской церкви: в 2 т. [Электронный ресурс] / А. Карташёв. – Париж, 1959. – Т. 2. – Режим доступа: http://krotov.info/library/k/kartash/kart000.html. – Дата доступа: 02.04.2011.

35. Сборник действующих и руководственных церковных и церковно-гражданских постановлений по ведомству православного исповедания / сост. Т. Барсов. – СПб.: Синодальная типография, 1885. – 663 с.

36. *Смолич, И.К.* История Русской Церкви. 1700–1917 гг.: в 2 ч. [Электронный ресурс] / И.К. Смолич. – М.: Валаамский монастырь, 1997. – Ч. 1. – Режим доступа: http://www.sedmitza.ru/text/439961.html.

37. *Ермоген, архиепископ.* К пятидесятилетию восстановления патриаршества (историко-каноническая и юридическая справка) / архиепископ Ермоген // Вестник Русского студенческого христианского движения. – 1867. – № 8. – С. 65–79.

38. Устав духовных консисторий. – СПб.: Синодальная типография, 1857. – 134 с.

39. *Грахоцкі, А.П.* Духоўны суд у Расійскай імперыі (другая палова XIX – пачатак XX ст.) / А.П. Грахоцкі // Правовое обеспечение устойчивого развития Республики Беларусь: сб. науч. трудов / под общ. ред. И.И. Эсмонтович. – Гомель: ГГУ им. Ф. Скорины, 2010. – С. 8–12.

40. *Римский, С.В.* Церковная реформа Александра II / С.В. Римский // Вопросы истории. – 1996. – № 4. – С. 32–48.

41. *Извеков, Н.Д.* Исторический очерк состояния православной церкви в Литовской епархии за время с 1839 по 1889 г. / Н.Д. Извеков. – М.: Печатня А.И. Снегирёвой, 1899. – 524 с.

42. *Миронов, Б.Н.* Социальная история России периода империи (XVIII–нач. XX вв.): в 2 т. / Б.Н. Миронов. – СПб.: Дмитрий Буланин, 2003. – Т. 1. – 548 с.

43. *Латкин, В.Н.* Учебник истории русского права периода империи (XVIII–XIX ст.) / В.Н. Латкин. – СПб.: Тип. С.-Петерб. тюрьмы, 1908. – 644 с.

44. Законы о состояниях // Свод законов Российской империи: в 16 т. – СПб., 1899. – Т. 9, ч. 1.

Поступила в редакцию 13.09.11.

В статье исследуется процесс трансформации административной структуры Русской православной церкви в XVIII–начале XX вв. под воздействием российского «конфессионального государства». Научная новизна исследования обусловлена обращением к правовому аспекту данной проблемы: в работе определяется степень соответствия/несоответствия церковной административной вертикали требованиям канонического права и отображаются механизмы инкорпорации церковных структур в бюрократический аппарат империи, выявляются коллизии канонического и светского (государственного) права. Результаты исследования могут быть использованы в научном, учебном и правотворческом аспектах: в процессе дальнейшего изучения правового положения христианских конфессий в Российской империи, правительственной конфессиональной политике и церковно-государственных взаимоотношений; в теоретических курсах по истории государства и права, истории России, религиоведению; в деятельности по совершенствованию правовых норм о свободе совести, религиозных объединениях и взаимоотношениях конфессий, гражданского общества и государства.

Ключевые слова: Русская православная церковь, административная структура, Российская империя, каноническое право, государственное законодательство, «конфессиональное государство», Святейший Синод, епархия, епископ, консистория, благочиние, приход, приходское духовенство.

The article focuses on the process of Russian Orthodox Church administrative structure transformation from XVIII till the beginning of XX century under the influence of Russian "confessional state". The newness of the research is in appeal to legal aspect of the problem: the article identifies the quality of conformance/unconformity of church administrative hierarchy to canon law requirements and depicts the mechanisms of church structures incorporation into Empire bureaucratic apparatus, reveales collisions of canon and temporal laws. The results of the research work can be applied in scientific, academic and law-making aspects; during the process of further Christian confessions legal status studying, governmental confessional policy and church-governmental relations; in theoretical material concerning state and law history; Russian history, religiology; in activities on improvement of legal provisions concerning freedom of conscience, in religious communities and relations of confessions, civil society and state.

Keywords: Russian Orthodox Church, administrative structure, Russian Empire, canon law, government legislation, "confessional state", Holy Synod, eparchy, bishop consistory, deanery, living, living ministry.